# ДАЧНЫЯ ЭЛЕКТРАСЕТКІ — НА ДЗЯРЖАЎНЫ БАЛАНС, ЧЛЕНСКІЯ ЎЗНОСЫ — ПРАЗ АГУЛЬНЫ СХОД

## Што яшчэ зменіць дакумент, які чакалі многія

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 155 «Аб садаводчых таварыствах», паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

**Дакумент накіраваны на ўстараненне назапашаных з улікам практыкі дзейнасці садаводчых таварыстваў прабелаў і супярэчнасцяў у заканадаўстве, спрашчэнне вырашэння многіх пытанняў, якія датычацца іх унутранай арганізацыі, удасканаленне падыходаў да знешняга кіравання таварыствамі, стварэнне ўмоў для развіцця іх інфраструктуры, навядзенне парадку на тэрыторыях.**

Указам **уводзіцца магчымасць перадачы на баланс дзяржаўных энергазабеспячальных арганізацый высакавольтных электрасетак таварыстваў па фактычным стане незалежна ад тэрміну іх уводу ў эксплуатацыю.**

Прадугледжваецца таксама **парадак перадачы ўнутраных сетак з наступным заключэннем прамых дагавораў электразабеспячэння з грамадзянамі — членамі таварыстваў.** Такая перадача будзе ажыццяўляцца пры ўмове знаходжання электрасетак у тэхнічна спраўным стане і ўстаноўкі (наяўнасці) вынасных прыбораў уліку расходу электраэнергіі.

Прыём у дзяржаўную ўласнасць электрычных сетак таварыстваў дасць магчымасць забяспечыць іх надзейную і бяспечную эксплуатацыю за кошт якаснага абслугоўвання спецыялізаванымі арганізацыямі, а **члены таварыстваў змогуць прымяняць тарыф на спажываную электраэнергію як для жыллёвага фонду.**

З улікам практыкі правапрымянення, а таксама меркавання грамадзян зменены **падыходы да фарміравання памераў членскіх узносаў.** Існуючыя нормы аб іх спагнанні незалежна ад памераў зямельных участкаў скарэкціраваны. Указам **дадзена права агульным сходам садаводчых таварыстваў самастойна прымаць рашэнні па згаданых пытаннях.**

Зыходзячы з запытаў на месцах і зваротаў грамадзян, а таксама грамадскай думкі аб павышэнні ролі дзяржавы ў сферы кантролю за дзейнасцю садаводчых таварыстваў, указам **мясцовыя органы ўлады надзяляюцца правам прызначаць старшыню праўлення таварыства** ў выпадку яго працяглай адсутнасці, а таксама асобнымі паўнамоцтвамі па бягучым кіраванні таварыствамі (напрыклад, патрабаваць правядзення пазачарговага агульнага сходу).

Для садаводчых таварыстваў **уводзіцца магчымасць атрымліваць у мясцовым выканкаме (на бязвыплатнай аснове) інфармацыю** аб адабранні і выдзяленні зямельных участкаў, аб дзяржаўнай рэгістрацыі пераходу правоў на зямельныя ўчасткі або долю ў праве на іх. Гэта будзе садзейнічаць вядзенню актуальнага ўліку членаў таварыстваў, рэалізацыі іх правоў і абавязкаў, выкананню правілаў унутранага распарадку, статута таварыства, выплаце ўзносаў, зямельнага падатку, падатку на нерухомую маёмасць і г. д.

Акрамя таго, дакументам **вызначаны парадак прыняцця членамі таварыства рашэння аб уключэнні яго тэрыторыі ў мяжу населенага пункта або ўтварэння на яго базе населенага пункта.**

**Урэгуляваны пытанні, звязаныя з паступленнем у камунальную ўласнасць безгаспадарных садовых домікаў,** а таксама адлюстраваны асаблівасці адчужэння садовых домікаў (долю ў праве на іх), прызнаных безгаспадарнымі або вымарачнай спадчынай. Таксама **ўрэгуляваны пытанні членства ў таварыствах асоб, якія з'яўляюцца ўдзельнікамі долевай уласнасці, пажыццёвага спадчыннага валодання або арэнды зямельнага ўчастка** (у выпадку атрымання ў спадчыну або пераходу правоў на зямельны ўчастак у долях).

Указам **уведзена магчымасць прыцягнення аўдытарскай арганізацыі або аўдытара для ўнутранага кантролю за дзейнасцю таварыства. Пашыраны і канкрэтызаваны пералік дакументаў, з якімі могуць знаёміцца члены таварыства** (са статутам, каштарысамі даходаў і расходаў, справаздачамі старшыні праўлення і рэвізійнай камісіі, пратаколамі агульных сходаў (сходаў упаўнаважаных), іншымі дакументамі таварыства).

**Устаноўлены дадатковыя меры для навядзення парадку на тэрыторыі таварystваў** (у прыватнасці, правядзенне інвентарызацыі ўчасткаў не радзей як адзін раз у тры гады).

Указ уступае ў сілу праз шэсць месяцаў пасля яго афіцыйнага апублікавання.

# «ПАПЯРЭДЗІЦЬ ПРАСЦЕЙ, ЧЫМ ЛІКВІДАВАЦЬ»

## Вадзім СІНЯЎСКІ расказаў, на чым у цяперашні час сканцэнтравана ўвага ратавальнікаў

**Аднак перш чым ахарактарызаваць аператыўную абстаноўку, міністр па надзвычайных сітуацыях уручыў узнагароды пераможцам і лаўрэатам рэспубліканскага конкурсу на найлепшае асвятленне ў СМІ дзейнасці МНС і асноў забеспячэння бяспекі жыццядзейнасці. Узнагароду з рук кіраўніка ведамства атрымала і рэдактар аддзела газеты «Звязда» Вераніка Канюта. Журналістка заняла першае месца ў намінацыі «Найлепшы аўтар».**


Фота прэс-службы Мінскага абласнога ўпраўлення МНС.

У размове з журналістамі Вадзім Сіняўскі абазначыў ключавыя задачы, асабліва актуальныя для ведамства ў найбліжэйшы час. «Аператыўная абстаноўка ў галіне папярэджання і прафілактыкі надзвычайных сітуацый у краіне дастаткова стабільная, — адзначыў міністр. — Нам удаецца ўтрымліваць ндярэнную дынаміку скарачэння гібелі людзей на пажарах. Вельмі разлічваем, што захаваем яе на працягу ўсяго года, але для гэтага трэба вельмі актыўна працаваць».

Па словах кіраўніка ведамства, другі кірунак, на які скіравана асаблівая ўвага ратавальнікаў, — папярэджанне гібелі людзей на вадзе. «Пачынаецца купальны сезон, — удакладніў ён. — На жаль, статыстыка паказвае, што ўжо цяпер мы маем павелічэнне колькасці загінулых на 30 чалавек у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. У кожным выпадку — жыццё чалавека. Для нас самае галоўнае — выратаваць чалавека, папярэдзіць яго, каб ён не трапіў у бяду. Формы і метады ў нас тыя ж. Ужо пачалі працаваць па апавяшчэнні насельніцтва аб небяспецы знаходжання каля вадаёмаў. У хуткім часе пачнём выкарыстоўваць авіяцыйнае патруляванне месцаў масавага адпачынку людзей і правядзенне там прафілактычных мерапрыемстваў па недапушчэнні знаходжання каля вадаёмаў у стане алкагольнага ап'янення, купання ў неўстаноўленых месцах і іншае».

Вадзім Сіняўскі заўважыў, што ў лясах — фактычна ва ўсіх рэгіёнах краіны — захоўваецца высокі ўзровень пажарнай небяспекі. «Таму ў першую чаргу важнае выкананне мер бяспекі, недапушчэнне распальвання вогнішчаў і выкарыстання мангалаў у лясах, таксама трэба чуць і выконваць забароны на наведванне лясоў у пажаранебяспечны перыяд», — рэзюмаваў міністр па надзвычайных сітуацыях.

**Вера АРЦЕМ'ЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прэзідэнтам Латвіі выбраны дзеючы кіраўнік МЗС Эдгарс Рынкевічс



Сейм Латвіі 31 мая ў трэцім туры галасавання выбраў прэзідэнтам краіны дзеючага кіраўніка МЗС Латвіі Эдгарса Рынкевічса. Аб гэтым паведамляецца на сайце латвійскага парламента.

Кандыдатуру Рынкевічса падтрымалі 52 дэпутаты, супраць прагаласавалі 35 парламентарыяў. Прэзідэнт выбіраецца абсалютнай большасцю галасоў дэпутатаў (51 голас са 100) тэрмінам на чатыры гады.

На пасаду прэзідэнта Латвіі, акрамя Эдгарса Рынкевічса, прэтэндавалі палітык і архітэктар Улдзіс Піленс, а таксама актывістка латышскай дыяспары ў Еўропе і эксперт па публічным кіраванні Эліна Пінта.

### Кіруючы альянс Эрдагана атрымаў большасць месцаў у парламенце Турцыі

«Рэспубліканскі альянс» на чале з Партыяй справядлівасці і развіцця (ПСР) прэзідэнта Рэджэпа Таіпа Эрдагана атрымаў 323 месцы з 600 у парламенце Турцыі. Аб гэтым паведаміў кіраўнік Цэнтрвыбаркама краіны Ахмет Енер, паведамляе ТАСС.

У адпаведнасці з канчатковымі данымі, Партыя справядлівасці і развіцця атрымала 268 месцаў, Новая партыя росквіту — 5, Партыя нацыяналістычнага руху — 50 (дадзеныя партыі ўваходзяць у «Рэспубліканскі альянс»), Народна-рэспубліканская партыя — 169 месцаў, Добрая партыя — 43. Турэцкая рабочая партыя атрымала чатыры мандаты, а Партыя зялёных левых — 61 крэсла.

Выбары ў парламент Турцыі прайшлі 14 мая адначасова з першым турам выбараў прэзідэнта краіны.

## Блізкая ўлада

# У ФАРМАЦЕ ШЧЫРАЙ РАЗМОВЫ

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з працоўным калектывам ТАА «Еўрагандаль». На сустрэчы прысутнічалі прадстаўнікі кампаніі з усіх рэгіёнаў краіны, а гэта каля 270 чалавек.**

Сустрэча працягвалася каля дзвюх гадзін, паведамляе БелТА. Быў абраны фармат шчырай, даверлівай размовы, падчас якой Наталля Качанава давала інфармацыю аб палітычным, сацыяльна-эканамічным жыцці краіны. У прыватнасці, спікер расказала, над чым працуюць члены Савета Рэспублікі пры рэалізацыі задач, абазначаных у ходзе VI Усебеларускага народнага сходу, Паслання кіраўніка дзяржавы беларускаму народу і парламенту. Закраналіся пытанні заканадаўчага рэгулявання, суверэнітэту, развіцця рэгіёнаў, цэнаўтварэння, сямейнай і маладзёжнай палітыкі, адукацыі, аховы здароўя, дзейнасці палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў. Гаворка таксама ішла аб ролі кожнага грамадзяніна ў пабудове моцнай дзяржавы. Члены працоўнага калектыву цікавіліся і асабістым жыццём спікера, яе перавагамі, напрыклад у літаратуры.

Наталля Качанава падкрэсліла, што на такіх сустрэчах прадстаўнікі дзяржаўных органаў не толькі даносяць інфармацыю, але яшчэ і камунікуюць з людзьмі, адказваюць на іх пытанні. «Вядома, для мяне гэта заўсёды вялікая радасць. Мне заўсёды прыемна бываць у працоўных калектывах, сустракацца з людзьмі. Для нас гэта вельмі важна, бо мы можам пачуць як рэальную сітуацыю, якая складваецца на канкрэтным прадпрыемстве, так і тое, што хвалюе нашых людзей. Таму такія сустрэчы ўзаемаўзбагачаюць», — адзначыла спікер.

## Па сутнасці

# ЧУЖЫХ ДЗЯЦЕЙ НЕ БЫВАЕ



Кажуць, птушкі — добры індыкатар навакольнага асяроддзя. Па колькасці птушыных насельнікаў можна ацаніць не толькі экалагічны стан мясцовасці, але нават і палітычную атмасферу. Тут няма ніякага пафасу. Кажуць, на Данбасе спачатку зніклі птушкі, а пасля — паляцелі снарады. Крылатыя вешчуны адчуваюць людзей, мясцовасць і нават падзеі, што маюць адбыцца... А да нас з выраю ляцяць чароды птушак. Жаваранка і салаўя можна пачуць нават у цэнтры сталіцы. Значыць, добра ім тут, маленькім і большым. І ў нас у краіне, значыць, усё нядрэнна.

Пад беларускім мірным небам снуюць ластаўкі, а над вёскамі ды аграгарадкамі лунае клёкат буслоў і птушыны шчэбет ды посвіст. Чуваць у гэтым хоры і зязюлю. Да Пятра — сярэдзіны лета — яна часта «сігналіць» аб сваёй бядзе. Згубленых, пакінутых дзецях. Вось так і ў людзей, нават сярод краін. Сімвал Беларусі, код нацыянальнага характару — гняздо бусла. У нас клёкат бусла — шматдзетнасць, будоўля, сяўба. У паўднёвых суседзяў, на жаль, — іншае. Вайна да апошняга жыхара. Не зважаючы, дарослы або дзіця. А дзеці Данбаса ў гэтай вайне нарадзіліся і растуць, становяцца дарослымі. Многія з іх ужо і не ведаюць, як гэта — калі мір.

Хоць на колькі часу ажыць, аднавіць сваё дзяцінства юным жыхарам Данбаса дапамагаюць беларусы. Усе. Людзі ў высокіх сталічных кабінетах, цэлыя грамадскія аб'яднанні з абласных цэнтраў і асобныя актывісты з рэгіёнаў, нават прыхаджане мінскіх і гродзенскіх храмаў збіраюць падарункі для дзяцей суседзяў. Карацей, уся Беларусь. Сам быў сведкам, як з фанфарамі і ў касцюмах казачных герояў цягнік з дзецьмі вайны сустракалі беларускія міліцыянеры. Ад цёплага прыёму гарача нават на лядовай пляцоўцы. Памятаеце, як хораша і лагодна Прэзідэнт сустракаў чарговых юных гасцей з тэрыторый вайны?

Мы не можам інакш. Не толькі таму, што нам баліць за гэтых дзяцей, як за сваіх уласных. Нам яшчэ баліць за дзяцей Хатыні і Краснага Берага. А цяпер нашчадкі тых, хто кідаў нашых дзяцей у вогнішча, хто разам з мамамі закопваў іх жывымі ў зямлю і гнаў у гнілое балота Азарычаў, хто забіваў немаўлят аб рог іх роднай хаты і выпіваў з іх кроў да апошняй кроплі ў пекле канцлагераў, спрабуюць абвінавачваць нас, што мы дзяцей Данбаса выкрадаем, вывозім іх з родных мясцін супраць волі іх бацькоў... Шляхта Еўропы ў шляхетнай сядзібе, якая сваіх дзяцей ператварае ў істот аморфнай шкалы гендарызацыі. І яны разяўляюць ляпу на Беларусь за тое, што наша краіна не стаіць у баку ад дзіцячых слёз. Слёз галодных дзяцей каля калючага дроту, праз які «гуманісты» назіралі за адурманенымі іх жа абяцанкамі бежанцамі з краін, якія яны, «гуманісты», і разбурылі...

Беларусь не стаіць у баку ад слёз дзяцей Данбаса, што за свае гады жыцця не бачылі міру і не чулі цішыні... А памятаеце, як спраўна паскудзілі фэйкамі ў 20-м пра нібыта скалечаную дзяўчынку падчас пратэстаў? Хутка выявілася — хлусня. Але ж «гуманісты» ўсіх масцей працягвалі енчыць: гвалт! Хочацца спытаць у іх: чаму не крычыце пра Алею анёлаў — забітых вайной дзяцей — у Данецку? Ці гэта іншае? Ці лепш і галоўнае — больш матэрыяльна выгадна абліваць граззю нашу краіну за тое, што мы прымаем дзяцей Данбаса? Маўляў, укралі. Ад чаго, ад каго? Ад вайны! Гэта трэба абавязкова зразумець. Найперш нам самім, бо тым, хто трымае дзяцінства пад прыцэлам, нічога не дакажаш. Дый ці трэба?

Перафразуючы вядомае выказванне, «скажыце, як краіна адносіцца да дзяцей, і я скажу, што гэта за краіна». Беларусь — краіна шчаслівага дзяцінства. З клёкатам буслоў, свежым ворывам на палетках ад трактарных плугоў, а не танкавых тракаў, і каруселямі.

І якімі б ілжывымі заявамі не спрабавалі ўджаліць палітычныя фарысеі Захаду, што б ні выдумлялі «праваабаронцы» трансгендарнай дэмакратыі... Няхай сабе лаюцца. А наша дзятва, дзякуй богу, шчабеча і будзе шчабятаць. І Беларусь была, ёсць і застанецца краінай шчаслівага дзяцінства. Не толькі для нашых дзяцей, бо мы не забыліся, што іх, дзяцей, чужых не бывае.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**